**ЛА́ЗНІК**, Лазеннік, Лазеншчык, Баннік, сядзібны нячысцік, злы дух вогненнага паходжання, які жыве ў лазні пад палком. Ён любіць мыцца і парыцца, дзеля чаго яму пакідаюць ваду і венік. Мыецца звычайна Л. пасля поўначы і таму не любіць, калі хто-небудзь застаецца да гэтага часу ў лазні. Несвоечасовага наведвальніка ён палохае ненатуральным храпам, шыпеннем, пайменнымі заклікамі, віскам, стукам у сцяну, варочаннем камянёў на каменцы і нават кідае іх з печы разам са смеццем, імкнучыся забіць парушальніка свайго спакою. Зларадны рогат Л. пужае запозненых у лазні жанчын і вымушае іх уцякаць голымі. У толькі пабудаванай лазні можна было мыцца, абавязкова задобрыўшы папярэдне Л., каб ён даў дазвол карыстацца ёю. Дзеля гэтага спецыяльна неслі ў лазню цёплы спечаны хлеб і клалі яго на палок. Гаспадар прыходзіў у лазню толькі праз 3 дні. Калі хлеб быў пагрызены, гэта значыла, што Л. дар не прыняў і аддаў мышам — тады прароблёнае трэба было паўтарыць зноў. Калі хлеб аказваўся прыплюснуты, гэта значыла, што Л. даваў дазвол на карыстанне лазняй. Тады гаспадар ішоў мыцца, а памыўшыся, выходзячы з лазні, павінен быў тройчы пакланіцца да зямлі і сказаць: «Дзякуй, Баннік, за баню! Дзякуй, Баннік, за пару!» (Барысаўскі раён). Не пераносіць Л. першапачатковай апрацоўкі лёну, пянькі, калі іх мнуць, трэплюць і папярэдне сушаць у лазні. Ён вымушаны цярпець смурод і пыл ад падгнілай кастрыцы і пры затрымцы гаспадароў з гэтай справай можа адпомсціць пажарам у лазні. Разам з тым існавалі і інш. адносіны да Л. Паколькі ён, як і *Ёўнік, Пуннік* — няпрошаныя сядзібныя госці, то іх не запрашалі пры пераходзе ў новыя збудаванні (як, напрыклад, *дамавікоў, хлеўнікаў*, якія лічыліся памочнікамі ў гаспадароў), і яны самі набягалі туды. Сумуючы ад бяздзейнасці, назойлівасці недарэчных наведвальнікаў, Л. мог пакінуць будыніну, дзе жыў. Яго зыход суправаджаўся разбурэннем прытулку: той згараў, развальваўся бураю, у ім правальвалася страха, столь, печка, крывілася сцяна. У падпраўленае збудаванне Л. зноў ужо не ўваходзіў.

*Літ.*: Беларускія народныя прыкметы і павер'і. Кн. 3. Зямная дарога ў вырай. Мн., 1999. С. 526—527.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ